Упраўленне  адукацыі
Полацкага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Яслі- сад №22 г. Полацка”

# <u>“ЗАЙКАВА ХАТКА”</u>

занятак
у старэйшай групе
з элементамі ТВВЗ- тэхналагіі

Выхавацель  дашкольнай адукацыі 1 катэгорыі
Балакірава Наталля Міхайлаўна

- Полацк 2019 год –

**Тэма**: “ЗАЙКАВА ХАТКА

**Праграмны змест**:
Працягваць практыкаваць у аналізе беларускіх казак, вылучаць праблемы казкі, прыдумліваць новы канец казкі. Практыкаваць у самастойным выбары паперы і вызначэнні знешняга выгляду свайго дома. Развіваць уменне вызначаць і вырашаць праблемы, увагу, сістэмнае і дыялектычнае мысленне, уяўленне, сувязную гаворку. Ствараць умовы для неўсвядомленага засваення беларускай мовы ў паўсядзённым узаемадзеянні.
Выхоўваць павагу да беларускай мовы, разуменне сэнсу беларускай казкі. Развіваць камунікатыўныя навыкі ў зносінах з аднагодкамі.

**Матэрыял**:
- мяч,
- карткі з намаляванымі героямі казак 11 штук,
- контурныя сілуэты звяроў: ліскі, ваўка, мядзведзя, вожыка,
- вялікія аркушы паперы рознага колеру,
- талеркі з сінімі, блакітнымі, белымі кругамі і трохкутнікамі,
- талеркі з жоутымі і карычневымі квадратамі, трохкутнікамі,
- магнітафон,
- беларуская мелодыя (фон).

**Змест**:

1. Выхаванцы сядзяць на сваіх месцах за сталамі.
**Выхавацель**: “ Сёння мы сустрэнемся з казкай. А пра каго гэта казка вы даведаецеся, калі адгадаеце жывелу на дарожцы. Прыгадваю, я магу казаць толькі “так” і “не”

2. **“Лінейная данетка**” з 11 карткамі, на якіх намаляваны героі казак
- воўк
- **ліса**
- мядзведзь
- вожык
- бусел
- Маша
- дзік

- кот
- верабей
- курачка
- певень

3.**Выхавацель:** “Назавіце беларускія казкі у якіх вы сустракаецеся з ліскай?”**МШ**

(«Зайкава хатка», «Коцік, Пеўнік і Лісіца», «Жаронцы», «Лісіца-хітрыца», «Як Кот звяроў напалохаў», «Селянін, Мядзведзь і Лісіца».)

4. **Выхавацель**: “Вы вельмі добра ведаеце казкі. Сапраўды. А сёння мы з вамі сусрэнемся з казкай “Зайкава хатка”. Паглядзіце ўважліва на дошку. Які казачны персанаж не сустракаецца у гэтай казцы. Які лішні?
Гульня “Чацвёрты лішні” ( ЛІСА, ЗАЯЦ, МЯДЗВЕДЗЬ, ВОЎК, ВОЖЫК)

5. **Выхавацель:** “Хто паспрабуе расказаць пачатак казкі. Калі ласка”

**Жылі-былі ў лесе лісічка і зайчык.**
**Жылі яны непадалёку адзін ад другога. Прыйшла восень. Холадна стала ў лесе. Надумаліся яны хаткі на зіму пабудаваць. Лісічка збудавала сабе хатку з труску-сняжку, а зайчык з труску-пяску. Перазімавалі яны ў новых хатках. Настала вясна, прыгрэла сонца. Лісічкіна хатка растала, а зайкавав стаіць, як стаяла. Прыйшла лісіца ў зайкаву хатку, выгнала зайку, а сама ў яго хатцы засталася.**

**Выхавацель**: Як выдумаеце, чаму лісічка выгнала зайку?
(**МШ -** нядобрая лісічка, цесна у хаце, лісічка на зайку зазлавала….)
Мы з вамі вырашылі праблему: ліска выгнала зайку таму што ў яго была маленькая хатка.
Дапаможам зайку? Зробім яму вялікую хатку. А хто захоча можа зрабіць прыгожую і вялікую хатку і для ліскі. Падыйдзіце да другога стала. На ім вялікія аркушы паперы рознага колеру, таксама ў маленькіх талерках: белыя, сінія, блакітныя кругі,

трохкутнікі, сняжынкі і жоўтыя, карычневыя авалы, кругі, квадрат. Я падрыхтавала клей, пэндзлі і сурвэткі. Паглядзіце на матерыял, а зараз заплюшчыце вочы і ўявіце той дом, які вы будзеце рабіць. Які матэрыял вам патрэбны? Паглядзіце колькі паверхаў у яго будзе, чым ён будзе ўпрыгожаны? Ці ёсць там балкон, калоны, лесвіца, вежы?

Вырашыце, які вам патрэбны матерыял і зрабіце новыя дамы для герояў казкі.

6. Самастойнае выкананне дзецьмі аплікацыі. Дапамога выхавацеля. ( гучыць беларуская мелодыя)

7. Выкладванне работ : вуліца.

8. Выхавацель : Мы вылучылі праблему: ліска выгнала зайку таму, што ў яго была маленькая хатка. Зараз у зайкі вялікая хатка.
Як наша казка скончыцца па новаму.

**Жылі-былі ў лесе лісічка і зайчык.**
**Жылі яны непадалёку адзін ад другога. Прыйшла восень. Холадна стала ў лесе. Надумаліся яны хаткі на зіму пабудаваць. Лісічка збудавала сабе вялікую хатку з труску-сняжку, а зайчык вялікую хатку з труску-пяску. Перазімавалі яны ў новых хатках. Настала вясна, прыгрэла сонца. Лісічкіна хатка растала, а зайкава стаіць, як стаяла. Прыйшла лісіца ў зайкаву вялікую хатку. Добра там, не цесна, усім месца хапае. Сталі яны там дружна жыць і адзін аднаму дапамагаць. Вось і казцы канец, а хто слухаў маладзец!**

9.**Выхавацель:** У казцы ёсць яшчэ адна праблема. Хто яе заўважыў. Так, вясной у ліскі хатка з сняжку растала.

10. Гульня"Добра- дрэнна"
**Выхавацель** (выхаванцы ў крузе) Чаму снег добры будаўнічы матэрыял?....Чаму снег дрэнны будаўнічы матэрыял?

11.**Выхавацель:** Як зберагчы снег вясной, калі надвор'е цёплае?

МШ.

12. Рэфлексія: Што спадабалаля на занятку? Якія праблемы мы варашалі? Які дом вам спадабаўся больш і чаму? Што здалося цяжкім і чаму?

13. Рытуал заканчэння занятка “Вялікі дзякуй за працу”(або “Абдымашкі” і “Малайцы”)

**<u>ДАДАТКОВЫЯ ЗАДАННІ:</u>**

1. Складанне загадак пра герояў казкі па малэлях
2. Пераказ казки с дапамогай мадэляу ( трохкутнік рыжага колеру сярэдняга памеру, круг белага колеру маленькага памеру, вялікі чатырохкутнік карычневага колеру, шэры трохкутнік сярэдняга памеру)
3. Увядзенне ў казку новага героя
4. Змяненне характару зайца або ліскі
5. “Падзорная труба”- Хто болей убачыў на карцінцы.
6. “Цягнічок часу” пераблыталіся карцінкі з казкі, трэба іх паставіць правільна.
7. Переказ казкі па карцінкам
8. Запіс казкі з дапамогай піктаграм
9. Уваход у казку: якое паветра, якія пахі, якія гукі казкі?